# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНАЙ МОЎНАЙ КАМПЕТЭНТНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ СРОДКАМІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

Ф.С. ШУМЧЫК, В.Ф. ЕПІШАВА

*Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсістэт інфарматыкі і радыёэлектронікі" філіял "Мінскі радыётэхнічны каледж", установа адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсістэт імя Максіма Танка"*

**Анатацыя.** Інфармацыйныя тэхналогіі – дзейсны сродак фарміравання прафесійнай моўнай кампетэнтнасці навучэнцаў. У аснове інфармацыйных тэхналогій ляжыць праектнае навучанне, якое стымулюе навучэнцаў на самастойную працу і пошук рашэнняў пры рэалізацыі праграмнага праекта – стварэнне беларускамоўнага вэб-сайта з улікам спецыфікі спецыяльнасці.

Для паспяховай рэалізацыі задачы фарміравання прафесійнай моўнай кампетэнтнасці навучэнцаў установ адукацыі, якія рэалізуюць праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, на занятках па вучэбным прадмеце «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» неабходна выкарыстоўваць эфектыўныя тэхналогіі, да ліку якіх адносяцца інфармацыйныя тэхналогіі.

У аснове інфармацыйных тэхналогій ляжыць праектнае навучанне, у цэнтры якой – самі навучэнцы, а мэта – фарміраванне ў іх самастойнасці, ініцыятыўнасці і крэатыўнасці. Гэтыя якасці развіваюцца дзякуючы асабістым дзеянням навучэнцаў у працэсе працы над праектам [1].

Эфектыўнасць праектнага навучання заключаецца ў тым, што навучэнцы матываваны на самастойную працу і пошук рашэнняў пры рэалізацыі праграмнага праекта. Перад імі ставіцца задача па стварэнні беларускамоўнага вэб-сайта з улікам спецыфікі спецыяльнасці.

Пры стварэнні беларускамоўнага вэб-сайта навучэнцам неабходна выступіць не толькі ў ролі франтэнд-распрацоўніка, вэб-дызайнера, але і паказаць глыбокія веды па змесце праекта, выявіць уменне працаваць з беларускамоўным кантэнтам, а менавіта падабраць тэкставыя файлы, файлы з выявамі розных графічных фарматаў, файлы з пашырэннямі .mp3, .mp4 і інш.

Паколькі навучэнцы валодаюць асновамі HTML і CSS, а таксама базавымі мовамі праграмавання, ім адносна не складана правесці вёрстку вэб-сайта. Для гэтага яны могуць карыстацца базавымі элементамі сайта, нават гатовымі шаблонамі. Галоўнае тое, што ім прыйдзецца самастойна падабраць у адпаведнасці з тэмай матэрыял, перакласці яго на беларускую мову і размясціць дарэчна на сайце.

Прапануем пазнаёміцца з прыкладам працы навучэнцаў па стварэнні беларускамоўнага вэб-сайта. Тэма праекта «Мая першая беларускамоўная вэб-старонка».

Перад навучэнцамі была пастаўлена задача: адлюстраваць першыя крокі будучага праграміста па стварэнні вэб-сайта. Таму зразумела, што навучэнцы размясцілі ў праекце інфармацыю пра базавыя паняцці вэб-канструявання.

Загадзя научэнцы падабралі адпаведны тэкставы матэрыял з розных крыніц па праграмаванні. Канешне, у асноўным гэты матэрыял быў узяты з

рускамоўных выданняў, таму прышлося навучэнцам папрацаваць над перакладам. На адным з заняткаў мы абмеркавалі праекты, праверылі, наколькі дакладна і правільна перакладзены тэксты.

Далей праводзілася праца па падборы неабходнага кантэнту: файлы з выявамі графічных фарматаў jpg, png, gif, з пашырэннямі .mp3, .mp4 і інш. Выкладчык на дадзенным этапе працы выступае ў ролі кансультатанта: дапамагае ў адпаведнасці са зместам падабраць ілюстрацыйны матэрыял, гукавое- і відэасуправаджэнне і г.д.

Калі неабходны матэрыял быў сабраны, навучэнцы прыступілі да праектавання макета будучай вэб-старонкі, старэння яе прататыпу, у якім выразна бачны кожны элемент. Праводзілася гэта праца для таго, каб навучэнцы мелі дакладнае ўяўленне аб тым, як у выніку будзе выглядзець вэб-старонка.

На аснове створанага макета навучэнцы пачалі вёрстку вэб-старонкі сродкамі мовы HTML з выкарыстаннем стылявых правілаў спецыяльнай мовы разметкі стыляў – CSS.

Вашай увазе прапануецца пазнаёміцца з фрагментам распрацаванай вэб-старонкі.

Фон вэб-старонкі аформлены ў “праграмісцкім” стылі – выява зямнога шара ў бягучым патоку кодавай інфармацыі ахутана ў сіні колер: <body background="fon2_IT.jpg">…..</body>.

Вэб-старонка пачынаецца з прывітання, якое аформлена ў выглядзе бягучага радка: <marquee behavior="streaming" direction="right">Вітаю ўсіх! Я frontend-распрацоўшчык!</marquee>.

На першым плане старонкі размешчаны тэматычныя загалоўкі двух узроўняў: <h1>Мая першая беларускамоўная veb-старонка</h1> <h2>З вэб-стронкі пачынаецца сайт</h2>.

Далей рамяшчаецца кантэнт, элементы якога для зручнасці аформлены блокамі (<div> </div>). Дзякуючы гэтаму элементу праграмавання “вэб-старонкі з дапамогай HTML5 могуць надзвычай лёгка стаць вэб-дадаткамі” [2, с. 582]:

<div> <p>Як тэатр пачынаецца з вешалкі, так і ўсякі <font color ="blue" size=5> HTML-дакумент</a></font> пачынаецца з базавай структуры. Яна складаецца з тэгаў, якія ёсць у кожным HTML-файле. Гэтыя тэгі і службовая інфармацыя патрэбны браўзеру для карэктнага адлюстравання інфармацыі.</p>

<p>У адпаведнасці з канцэпцыяй сучаснай вэб-распрацоўкі html-код павінен утрымліваць толькі тэгі і кантэнт у іх. Для апісання знешняга выгляду сайта выкарыстоўваюцца стылявыя правілы спецыяльнай мовы разметкі стыляў -- CSS. Табліцы стыляў дазваляюць вызначыць колер і знешняе аблічча тэкставага фрагменту, уносіць змены ў гэтая параметры ўнутры тэкставага блоку, выконваць выроўніванне тэкставага блоку адносна іншых блокаў і кампанентаў старонкі, і многае іншае, што дае магчымасць якасна адфарматаваць кантэнт, "ажывіць" вэб-старонку, зрабіць яе больш прыгляднай для чытача (карыстальніка).</p> </div>.

Паралельна з напаўненнем вэб-старонкі змястоўнай інфармацыяй праводзіцца яе стылявое афармленне шляхам падключэння файла .css (<link rel = stylesheet type = text/css href = main.css>). У рамках css-файла элементам вэб-

старонкі надаюцца ўласцівасці (шрыфт, колер, выроўніванне, палі, водступы і г.д.) і значэнні гэтых уласцівасцей. Напрыклад,

marquee{font-family:Arial; font-size:20pt; font-weight:bolder; color:red; margin-top:10px;};

h1{text-align:center; font-weight:bolder; color:yellow; size:14pt;};

h2{text-align:center; font-style:oblique; font-weight:bolder; color:red; size:20pt;};

div{font: normal 20pt Tahoma; font-weight:bolder; color: yellow; text-align: justify;}.




Зразумела, што праца над праектам – гэта самастойная праца навучэнцаў, якую яны выконваюць як хатняе заданне. Але абавязкова на адным з заняткаў навучэнцы ў якасці заключнага этапа працы над праектам дэманструюць перад аўдыторыяй свае праекты, расказваюць на беларускай мове аб яго змесце, дзеляцца вопытам напісання праграмы (якімі карысталіся прыёмамі, «фішкі» кода і г.д.), чаму навучыліся, якія моманты працы засталіся нявырашанымі, магчымыя шляхі дальнейшага ўдасканалення праекта.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Технология проектного обучения: суть, цели, этапы и методы / https://school.kontur.ru/publications/2447 [Доступ: 14.05.2025].

2. Никсон, Р. Создаем динамические веб-сайты с помощью PHP, MySQL, JavaScript, CSS и HTML5. // Р. Никсон. – 4-е изд. – СПб., 2016. – 768 с.: ил.